***Т. Ф. Сухоцкая,***
*канд. культуралогіі, дац.,*
*дац. каф. культуралогіі БДУКМ*

# СЕМАНТЫКА ВЫСЛОЎЯ Ў ТВОРАХ ЯКУБА КОЛАСА

Духоўная спадчына з'яўляецца не толькі сродкам пазнання культуры – яна яшчэ фарміруе духоўны імунітэт суб'екта, яго здольнасць супрацьстаяць націску антыкультуры. Менавіта вербальная культура з'яўляецца індыкатарам сацыяльнага і культурнага развіцця грамадства. Беларуская мастацкая літаратура XX ст. стала формай духоўнага самасцвярджэння нацыі, а моўная дзейнасць – адным з галоўных сродкаў самавызначэння і самаканстытуявання этнасу. Зварот да сэнсатворнай дзейнасці Якуба Коласа ўзбагачае выяўленне зместу шматграннай спадчыны вядомага дзеяча беларускай культуры. Культуралагічнае асэнсаванне слоўнага мастацтва паэта раскрывае яго ўклад у тварэнне беларускай культурнай прасторы. Слова для Якуба Коласа – сродак выяўлення ўласнага светапогляду, таленту. Максім Гарэцкі адзначаў, што «Колас поўнаю жменяю чэрпае з багатых крыніц народнае мовы, што ў значнай меры і дапаўняе яго індывідуальную пяснярскую вобразнасць, надаючы, апроч таго, нацыянальна-народную каларытнасць яго мове і ўсёй творчасці» [1, с. 317]. Пісьменнік быў майстрам малых форм творчасці – афарыстычных выказванняў, аўтарскіх прыказак, трапных найменняў, алегарычных дыялогаў, перыфразаў, каламбураў, тостаў, параўнанняў, анекдотаў, праклёнаў і г. д., што могуць быць аб'яднанаы агульным паняццем выслоўя, якое стала адметнасцю стылю народнага песняра. Аўтарскае выслоўе – гэта знітаванне індывідуальнага аўтарскага светаўспрымання з тысячагадовым сумарным вопытам народнага мыслення.

Унікальная форма народнай культуры – выслоўе – узнікла ў далёкай старажытнасці як сродак камунікатыўных зносін. У ёй як і ў іншых малых жанрах фальклорная маўленчая дзейнасць беларусаў акумулявала свой духоўны вопыт. Каштоўнасны сэнс дадзенай формы выяўляецца праз магічную, эстэтычную і інвектыўную функцыі ў жыццядзеянні грамады. Паводле зместу і функцыянальнага прызначэння вылучаюць выслоўі-жарты і каламбуры, вітанні і зычэнні, прысяганні, праклёны,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ганьбаванні, дражнілкі-кепікі з ужываннем уласнага імя, выслоўі-параўнанні. Займаючы прамежкавае становішча паміж фразеалагізмамі, з аднаго боку, і прыказкамі і прымаўкамі, з другога, яны ўспрымаюцца як універсальны фальклорны тэкст, маўленчы стэрэатып, які нясе глыбокі абагульнены маральна-філасофскі сэнс і мае лагічнае, закончанае афармленне. Выслоўе вызначаецца лаканічнасцю, адшліфаванасцю формы. Агульнавядомая думка часам па-новаму адкрывае схаваны ў ёй неадназначны сэнс, набывае незвычаўную поліфанічнасць.

Выслоўі Якубам Коласам ствараюцца па ўзору тысячагадовай народнай моўнай творчасці, але ён іх не бярэ ў гатовым выглядзе, а творыць. Семантыка выслоўяў паэта – гэта адбітак багацця, шматграннасці, разнастайнасці быцця беларусаў: нараджэнне і кананне чалавека, розум і душа беларуса, сэнс жыцця і вартасць учынкаў, характар і светапогляд і г.д. Выслоўі паэта – гэта вялікі культурны прарыў беларускай нацыі ў ХХ ст.

Якуб Колас добра ўсведамляў культурную вартасць і магчымасці выслоўя, аднак не імкнуўся ствараць яго як самастойны твор, а па-майстэрску ўводзіў у кантэкст сваіх больш буйных твораў. Тым не менш многія з іх жывуць самастойным жыццём, валодаюць патэнцыяльнай «крылатасцю»: «Мой родны кут, як ты мне мілы!..», «Як паглядзіш – божа мілы! Што з людзямі робіць чын?», «…веды ў адну столку», «Пацяробкі культуры», «Ну, дзядзька, як мы тут стаіма? / – А так, як цюцька за дзвярыма!», «Не на дажджы я, часу маю, / Не пан я, трохі пачакаю».

Ёсць выслоўі, якія не прэтэндуюць на «крылатасць», бо гэта хутчэй разважанні, мудраслоўі, вартасць якіх пацвярджаецца іх адасобленым перакладам на іншыя мовы. Яны прызначаны не для выкарыстання ў маўленні ў якасці «літаратурных прыказак», а хутчэй для ўдумлівага асэнсавання. Сярод такіх выслоўяў сустракаюцца вялікія, але вельмі гарманічныя па структуры выказванні, што сведчыць аб дасканалым валоданні Я. Коласам багатымі і разнастайнымі сродкамі мовы. Такімі з’яўляюцца паэтычны і празаічны прыклады: «Я не зайздрошчу тым з вас, брацці, / Каго спрадвечныя закляцці / Не парушалі, не тамілі / І цяжкім каменем не білі, / І для каго ўвесь белы свет / Ёсць аднае цялежкі след, / Пытанні толькі дабрабыту, / Дзе ўсё прыводзіцца к карыту… / Не! Духу волі плынь жывая / Такога ладу не прымае / І не прыхіліцца ніколі / Да гэтай лішне

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

простай долі» («Новая зямля»); «Тысячамі дарог і ў розных кірунках збягае вясною снегавая вада. Як многа гэтых дарог і як разнастайны яны ў сваім руху і сіле свайго імкнення! Тысячамі дарог і ў розных кірунках ідуць людзі, шукаючы сабе прастору, волі і ўсяго таго, што называюць яны сваёй радасцю і шчасцем» («Дрыгва»). Так настойліва на працягу ўсяго творчага шляху Я. Колас акумулюе новыя сэнсавыя значэнні топаса «шлях», пашырае духоўны свет чалавека.

Выслоўнасць Якуба Коласа – гэта перш за ўсё сэнс, думка, развага-ацэнка: «Каб выказаць разумную думку, не трэба многа прыгожых і выкрутасістых слоў», – заўважае адзін з герояў пісьменніка, Сцёпка з аповесці «На прасторах жыцця». Сэнс жыцця раскрываецца ў адказе бабкі-старожкі маладому настаўніку-інтэлігенту Лабановічу ў аповесці «На ростанях»: «Каб вы запыталіся ў дрэва, чаму яно расце, дык хіба ж бы яно вам адказала?».

У семантыцы мовы адлюстраваны агульныя, універсальныя кампаненты агульначалавечай культуры і адметнасць культуры канкрэтнага народа. Выслоўе Якуба Коласа рэпрэзентуе нацыянальны менталітэт: «Мой брат беларус! Тваёй сіле, / цярпенню твайму – пакланіцца», «Увесь час варушымся, збіраем, / Канца ж патрэбам тым не маем», «Хоць шмат на свеце ёсць маны, / Для праўды ж – не – няма труны: / З вады ўсплыве яна і з змроку», «Калі ты з панам не ў ладу, / Трымайся лепш за грамаду», «Ёсць важныя дзве часціны, з якіх складаецца жыццё і яго глыбокі сэнс і хараство – чалавек і прырода», «Не ў адным толькі сэрцы людзей / Іскра праўды гарыць – Аб ёй песню пяе салавей, / Аб ёй рэчка журчыць», «Зямля, зямля, / Свой пэўны кут, свая ралля: / То – наймацнейшая аснова / І жыцця першая ўмова. / Зямля не зменіць і не здрадзіць, / Зямля паможа і дарадзіць, / Зямля дасць волі, дасць і сілы, / Зямля паслужыць да магілы, / Зямля дзяцей сваіх не кіне, / Зямля – аснова ўсёй айчыне», «І едзем мы на нейчым возе / Ды ўсё дарожкаю крывой».

Выслоўе Я. Коласа – канцэнтравана выражаны ў мове нацыянальны вопыт ацэнкі і дзеяння на аснове гэтай ацэнкі. Паэт перадае думку коратка, трапна: «Няма чаго чакаць панукі, / Калі работы поўны рукі», «Вучыся, нябожа, вучэнне паможа», «А будзе йсці навука туга, / Падгоніць бацькава папруга!». Выхаваўчы патэнцыял такіх выразаў дзейсны.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

У межах семантычнай структуры выслоўя заўсёды назіраецца сціcканне вялікай інфармацыі, універсальнай, і індывідуальна-аўтарскай, абноўленай. У выслоўі яна становіцца неаддзяляемай ад культурнага сэнсу. Некаторыя выслоўі выступаюць як маральныя імператывы, у якіх канцэнтруюцца сэнсы: «Які прывет – такі прыём / Які тавар – такая плата».

Выслоўе Я. Коласа трапна і з’едліва высмейвае прыгнятальнікаў беларускага народа, паноў і чыноўнікаў. Семантыка выказванняў выйшла далёка за пэўныя храналагічныя межы: «Ото паноў, о, божа мілы! / Якія гладкія іх рылы!», «Адны трымаюць нос высока / Другія ў дол спускаюць вока», «Малы разгон, а ўзмах вялікі», «Сядзяць пісцы, як гною кучкі…», «І ён канчае, ставіць кропку… / І моршчыць розуму каробку», «Не шуршаць паперы пад даклад пусты».

Выслоўе Якуба Коласа – сведчанне яго генію, інтэлекту, адлюстраванне аўтарскага светабачання: «Добра быць у дарозе, якую ты сам выбіраеш», «Сабраць з дарог каменні тыя, / Што губяць сілы маладыя». Праблема культурнай памяці акрэслена ў выслоўі «Абшарыць кішэні свае памяці». Выказванні паэта набываюць асаблівую вобразнасць, эмацыянальнасць, ацэначнасць і пераканаўчасць.

Актыўна працуючы на ніве асветы і ў галіне мастацкай літаратуры, Я. Колас вёў нястомную барацьбу за культуру і чысціню мовы. Ён лічыў, што «слова для пісьменніка – гэта асноўная канва, на якой будуе ён сваю мастацкую творчасць [2, с. 152]. Мастацкі талент Я. Коласа здолеў стварыць адметныя па сіле эстэтычнага ўздзеяння творы з глыбокім культурфіласофскім зместам – арыгінальныя паэтычныя формулы мудрасці. Выслоўі Я. Коласа папоўнілі велізарную скарбніцу нацыянальнай словатворчай культуры. Працэс сэнсатворнай дзейнасці, нягледзячы на рэцэдывы дэнацыяналізацыі, працягваецца і ў нашы дні. Па-ранейшаму прыярытэтную ролю ў фарміраванні сэнсатворных лексікодаў адыгрывае беларуская мова.

1. *Гарэцкі, М.* Гісторыя беларускай літаратуры / М. Гарэцкі ; уклад. Т. С. Голуб ; рэд. М. І. Мушынскі. – Мінск : Маст. літ., 1992.

2. *Колас, Я.* Збор твораў : у 14 т. / Я. Колас. – Мінск : Маст. літ., 1976. – Т. 11.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ